УДК 811.161.3'373(045)

# СРОДКІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ПАНЯЦЦЯ *ПАРАЖЭННЕ* Ў БЕЛАРУСКАЙ МОЎНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ

***А.А. КУЦ***
***(Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт)***

*Дадзеная праца ўяўляе сабой апісанне фрагмента беларускай моўнай карціны свету «Паражэнне», які можа быць крыніцай матэрыялу для беларускага лінгвакраязнаўчага слоўніка. У артыкуле вызначана сукупнасць прыкмет, якія складаюць ментальную сутнасць паняцця «паражэнне», выяўлены асноўныя лексічныя рэпрэзентацыі паняцця, складаныя сумешчаныя рэпрэзентацыі, устойлівыя асацыятыўна-вобразныя рэпрэзентацыі. Лінгвістычныя даныя атрыманы ў выніку аналізу 500 кантэкстаў газетна-публіцыстычнага стылю, знойдзеных у выданнях «Звязда» і «Наша Ніва», матэрыялы якіх змяшчаюцца ў Беларускім N-корпусе.*

***Ключавыя словы:*** *моўная карціна свету, паняцце, ідэаграфічны прынцып апісання лексікі, ментальная сутнасць паняцця, лексічная рэпрэзентацыя паняцця.*

Моўная карціна свету – гэта прадукт свядомасці, вынік узаемадзеяння мыслення, рэчаіснасці і мовы як сродку выказвання думак аб свеце ў актах камунікацыі [1, с. 188], моўнае чляненне свету, упарадкаванне прадметаў і з'яў, інфармацыя пра свет, якая закладзена ў сістэмных значэннях слоў [2, с. 38]. Моўная карціна свету ўяўляе сабой абстракцыю. Аб'ектыўна існуюць і могуць быць прааналізаваны моўныя карціны свету толькі канкрэтных нацый. *Нацыянальная моўная карціна свету* ёсць «вынік фіксацыі аб'ектыўнага свету моўнай свядомасцю канкрэтнай моўнай супольнасці, канкрэтнага этнасу» [3, с. 113]. Такім чынам, беларуская мова паўстае не толькі сродкам пранікнення ў арганізацыю ментальнай сутнасці ключавых паняццяў *беларускага этнасу*, але і сродкам яе даследавання.

Асаблівую актуальнасць на сучасным этапе развіцця беларускай лексікаграфічнай справы набывае апісанне ключавых паняццяў беларускай культуры, складанне фрагментаў слоўнікавых артыкулаў, якія фіксуюць культурна-нацыянальныя ўяўленні беларусаў аб рэчаіснасці, адметнасць і самабытнасць сучаснага стану беларускай мовы. Мова ўяўляе сабой семіятычную сістэму, якая складаецца з абагульненых патэнцыйных знакаў (слоў). Патэнцыял слова ў цэлым і яго культуралагічны патэнцыял вызначаюцца менавіта пры ўжыванні ў тэксце. У тлумачальных слоўніках адлюстроўваюцца толькі самыя агульныя і істотныя прыкметы прадмета або з'явы – *лексічнае паняцце*. Сродкам пашырэння лексічнага паняцця можа быць *лексічны фон,* частка семантыкі слова, дзе захоўваецца нацыянальна-культурная інфармацыя [4, с. 2; 5, с. 73]. *Лексічны фон* вызначаюць праз разгортванне ў схаваным выглядзе інфармацыі ў мастацкіх і публіцыстычных тэкстах [5, с. 133]. Асаблівую актуальнасць для разгортвання ў схаваным выглядзе нацыянальна-культурнай інфармацыі ўяўляюць сабой тэксты газетна-публіцыстычнага стылю. У адрозненне ад іншых стыляў, яны характарызуюцца ўніверсальнасцю і актуальнасцю, перыядычнасцю і публічнасцю, а таксама ўласцівасцю масавай чытальнасці. Адпаведна, гэта дазваляе тэкстам газетна-публіцыстычнага стылю як фіксаваць, так і аказваць уплыў на сучасны стан беларускай моўнай карціны свету. Я.М. Верашчагін і В.Р. Кастамараў перакананы, што пацвярджальныя спасылкі як на класічныя тэксты, так і на газеты і часопісы, маюць аднолькавую доказную сілу [5, с. 433].

З аднаго боку, паняцце – гэта прадукт разумовай дзейнасці і вынік пазнання, у якім рэзюмуецца пэўная сукупнасць ведаў, таму яно функцыянуе ў якасці інструмента класіфікацыі. Так, паняцце ўяўляе сабой правіла, прымяненне якога да апісання аб'екта дазваляе вызначыць прыналежнасць дадзенага аб'екта да таго мноства, якому адпавядае найменне, што разглядаецца. З іншага боку, паняцце мае план выражэння – лексему, таму яно належыць узроўню мовы [4, с. 13]. У дадзеным артыкуле апісанне паняцця *паражэнне* згодна з прынцыпам пабудовы слоўнікавых артыкулаў [6], умоўна падзелена на 2 часткі, у якіх адлюстроўваецца ментальная сутнасць паняцця і асноўныя сродкі яго рэпрэзентацыі. Прадстаўленыя ў артыкуле даныя атрыманы ў выніку аналізу семантыка-сінтаксічных асаблівасцей адзінак у 500 кантэкстах артыкулаў «Звязды» і «Нашай Нівы», у якіх актуалізуецца слова *паражэнне*. Усе разгледжаныя артыкулы размешчаны ў Беларускім N-корпусе [7].

Першая частка прадстаўлена ў выглядзе разгорнутай слоўнікавай дэфініцыі, якая складаецца з сукупнасці кагнітыўных прыкмет. Такая сукупнасць кагнітыўных прыкмет ёсць ментальная сутнасць паняцця. Паняцце ўяўляе сабой іерархічна арганізаваную палявую структуру, скампанаваную на падставе ідэаграфічнага прынцыпу апісання лексікі.

Так, **ядро паняцця *паражэнне*** прадстаўлена сукупнасцю базавых кагнітыўных прыкмет, атрыманых на аснове метаду абагульнення слоўнікавых дэфініцый слова «паражэнне» на падставе тлумачальных слоўнікаў беларускай мовы [8–10]: *поўны разгром праціўніка, чалавека, які імкнецца перамагчы іншага,*

*пазбаўленне яго баяздольнасці з прычыны няўдачы, пройгрышу, адмоўнага выніку, няшчаснага збегу абставін у чым-небудзь.*

**Прыядзерная зона паняцця *паражэнне*** змяшчае істотныя кагнітыўныя прыкметы (абумоўленасць, аб'ектнасць, суб'ектнасць, працягласць у часе і прасторы, форма), якія канкрэтызуюць паняцце. Такім чынам, *паражэнне* ўяўляе сабой значную адмоўную сацыяльную падзею, якая з'яўляецца вынікам беспаспяховай чалавечай дзейнасці. Часцей *паражэнне* мае месца пры адсутнасці пэўных станоўчых якасцей у чалавека і валявога ці рашучага прымянення намаганняў (разумовых або фізічных), накіраваных на паспяховае пераадоленне перашкоды ў спартыўнай, палітычнай, ваеннай, рэлігійнай, любоўнай сферах: *Досвед нашага паражэння ў Расіі і Беларусі гаворыць аб тым, што **дзейнічаць трэба імкліва і жорстка**, каб не было падстаў да гэтага вяртання. Бо вяртанне магчыма* (Наша Ніва); *Галоўны трэнер зборнай выказаў упэўненасць у тым, што гісторыя з «Кубкам Палесся», на якім, нагадаем, каманда ў лістападзе 2011 года зведала поўнае фіяска, калі з буйным лікам прайграла ўсе матчы і **прадэманстравала вельмі слабую гульню**, не паўторыцца. «Зараз у нас абсалютна іншая каманда, іншы ўзровень. У Гомелі гэта быў своеасаблівы няўдалы эксперымент»* (Наша Ніва). *Паражэнне* можа быць абумоўлена суб'ектыўнымі фактарамі, напрыклад, памылкай чалавека ў якой-небудзь справе, пачынанні (*пракол, асечка, агрэх, памарка*): *Нямецкіх палітыкаў падводзіць «райнэ фэрнунфт» – чыстае мысьленьне: яны спачатку прыдумваюць тэзіс, а потым упарта яго адстойваюць. І толькі ў выніку фіяска пачынаюць разумець, што зрабілі памылку* (Наша Ніва); аб'ектыўнымі – наяўнасцю падзей, якія перашкаджаюць перамагчы: *Прыхільнікі піцерскай каманды кінулі на поле петарду, якая параніла галкіпера супернікаў Антона Шуніна, за што «Зеніту» было залічана тэхнічнае паражэнне* (Наша Ніва); *Такім чынам, галоўнай прычынай пройгрышу Францыі назвалі суровую зіму (46%) і толькі потым успомнілі пра гераізм рускіх салдат (41%)* (Звязда); ці абставінамі: *адсутнасць вопыту; нядбатнасць; адсутнасць зладжанасці ў дзеяннях; залішняе хваляванне; бязглуздая, непрафесійная, неахайная праца.*

Чалавек, аналізуючы існуючыя абставіны, можа заўважыць якія-небудзь прыкметы, сітуацыі, якія прадказваюць паражэнне. Такімі прыкметамі могуць служыць інтуітыўныя прадчуванні, прадказанні, заснаваныя на аб'ектыўных фактах: *Букмекеры і футбольныя спецыялісты яшчэ да пачатку матча прадракалі беларусам паражэнне. Да гэтага іх прымушалі не толькі траўмы лідараў нашай зборнай, але і тое, што славакі перад пятнічнай гульнёй былі звышматываваныя* (Звязда). Аднак адзначаны выпадкі, калі паражэнне цярпіць бок, які не мае на тое ніякіх перадумоў. У гісторыі вядомыя выпадкі, калі паражэнне цярпелі сілы, якія значна перавышалі саперніка па магутнасці і колькасці: *Аршанская бітва, адбылася 8 верасня 1514 года, у ёй удзельнічала войска ВКЛ пад кіраўніцтвам князя Канстанціна Астрожскага (**прыблізна 30 тыс.**), якое выступіла супраць маскоўскіх атрадаў Івана Чалядніна і Міхаіла Булгакава-Голіцы (**каля 80 тыс.**), у яе выніку адбылося паражэнне маскоўскіх атрадаў, **нягледзячы на значную колькасную перавагу*** (Наша Ніва); *Горшае паражэнне ў нашай гісторыі. Англія прайграла краіне, дзе вулканаў больш, чым прафесійных футбалістаў. Ісландцы гулялі выдатна* (Звязда).

Шматвяковы вопыт народа прасочваецца ў разгортванні адносін паміж суб'ектам і іншымі катэгорыямі мовы [2, с. 96]. У розны час **суб'ектам** і **аб'ектам** паражэння можа з'яўляцца як адна і тая ж **асоба ці індывід** (*Аляксей Калюжны*, *Вікторыя Азаранка, Вольга Гаварцова, Іван Ціхан, Канстанцін Астрожскі, Максім Мірны, Сяргей Жыгалка, Сяргей Кісляк, Уладзімір Пуцін*), так і **група асоб** (*апазіцыя, войска, баскетбалісты, зборная Беларусі, каманда, клуб, маскоўскі атрад, немцы, паліцаі, фашысты; Вайна – гэта барацьба, у ёй ёсць пераможцы і пераможаныя, пераможцы – гэта савецкія салдаты, падпольшчыкі, партызаны, а пераможаныя – гэта немцы і паліцаі* (Наша Ніва). **Суб'ектам паражэння таксама** *зафіксаваны* і **абстрактныя сутнасці** (*жыццё пацярпела паражэнне, фіяска церпіць канцэпцыя, паражэнне рэжыму, поўнае фіяска эканамічнай мадэлі, фіяска ранейшых абяцанняў, паражэнне гвалту*). У некаторых прыкладах само паражэнне выступае **суб'ектам** дзеяння: ***паражэнне не дазваляе** камандзе падняцца вышэй 9-га радка; **паражэнні робяць** чалавека мацнейшым; яго **чакала фіяска**.* Неабходна адзначыць, што аб'екты паражэння ніколі не застаюцца ў статусе пераможаных перманентна, таксама як і суб'екты, якія нанеслі паражэнне. Гэтыя статусы часовыя і могуць чаргавацца: *Роўнасць перад Богам замяняецца роўнасцю шанцаў і магчымасці для пераможцы і пераможанага памяняцца месцамі* (Наша Ніва).

**Суб'екты** паражэння атрымліваюць мянушкі, якія ўзвялічваюць іх: *Нязломны; Грозны; Адважны; Люты*. **Аб'ектаў** паражэння часцей за ўсё называюць словамі, якія, наадварот, прыніжаюць іх годнасць: *няўдачнік, лузер;* (*Тым не менш, у «кубку **лузераў**», як крыўдна назваў гэты турнір спартакавец Бранка Радзівоевіч, беларусы пачалі выступаць нядрэнна* (Звязда); *За два туры да фінішу вызначыліся два з трох няўдачнікаў чэмпіянату Беларусі па футболе сярод камандаў вышэйшай лігі – гэта мінскі «Лакаматыў», які дэбютаваў у гэтым сезоне, і ждановіцкая «Дарыда», якая выступала сярод наймацнейшых з 2003 года* (Звязда).

Рэалізуецца паражэнне падчас розных мерапрыемстваў (палітычных, ваенных, эканамічных, спартыўных, навучальных, сацыяльна-бытавых): *конкурсы, кубкі, матчы, паядынкі, дэбаты, чэмпіянаты, турніры, алімпіяды* (прадметныя, спартыўныя), *спартакіяды, святы, кампаніі, турзлёты, гонкі* (*палітычныя*).

**Паражэнне рэалізуецца ў часе**. Назіраецца тэндэнцыя пазначаць **дату** падзеі: *19 лістапада каманда саступіла чэмпіёну Расіі «Салавату Юлаеву» з лікам 1:3* (Звязда). Перад паражэннем і пасля яго

**вылучаюцца этапы**, кожны з якіх мае пэўныя часавыя інтэрвалы: інтэрвал часу перад паражэннем, кульмінацыйны пункт, які азначае сам момант паражэння, і этап пасля – своеасаблівую развязку. Па працягласці этапы бываюць рознымі, так, калі пасля паражэння суб'ект не знаходзіць маральных сіл трымацца, ён можа сысці ў доўгатэрміновую дэпрэсію, некаторыя разумеюць, што трэба як мага хутчэй забыцца пра паражэнне і ісці далей: *Баяўся, каб яны не апусцілі пасля гэтага рукі, змаглі псіхалагічна вытрымаць паражэнне, – адзначыў кіраўнік федэрацыі* (Звязда); *Але важна хутка забыць пра гэту перамогу – гэтак жа, як хутка трэба забываць і пра паражэнні* (Звязда). Пераможаныя найчасцей жадаюць аднавіць чысціню свайго імя, рэпутацыі, інакш кажучы, рэабілітавацца пасля таго, як іх напаткала няўдача: *Пасля нядаўняга вялікага паражэння ад паўночнаірландцаў (0:3) беларускім футбалістам вельмі хацелася рэабілітавацца перад балельшчыкамі* (Звязда); *Гаспадары шосты раз сталі пераможцамі турніру, узяўшы «рэванш» за леташняе паражэнне* (Наша Ніва).

**Паражэнне можа быць графічна аб'ектывавана ў выглядзе лініі**, якая рухаецца наперад і рэзка ўніз: *Па-рознаму рэагуюць людзі на ганьбу і паражэнне. Адных няўдачы апускаюць яшчэ ніжэй, на дно, адкуль не падняцца; для іншых яны могуць зрабіцца той стартавай сілай, той іскрай, якой якраз і бракавала, каб разгарэўся ў іхнім жыцці вялікі і яркі агонь* (Звязда); *Ведаеце, лепш пачаць з паражэнняў, чым адразу ўзняцца на вяршыню, а* ***потым зваліцца*** *з яе. Па лесвіцы патрэбна ўзнімацца паступова – у гульнявым, эмацыянальным плане.* (Звязда). Так, перамогі і паражэнні асацыіруюцца з рухам па лесвіцы. Рух уверх ці ўніз можа быць як павольным, так і імклівым: *Гаспадары пацярпелі першае паражэнне, саступіўшы 13 студзеня бельгійцам з лікам 0:1* (Звязда). Такім чынам, паражэнне – гэта «крок уніз». Каб утрымацца на пазіцыі пераможцы і не сысці ўніз, трэба многа працаваць: *Пераможаныя пераможцы мусяць зразумець, што нешта ў сьвеце зьмянілася і без сур'ёзных укладаньняў у спорт нельга заставацца на вышыні* (Наша Ніва).

Рух пачынаецца з кропкі-зачыну і працягваецца ў кірунку да свайго кульмінацыйнага пункта: *Каманду на берагах Нёмана арганізавалі год таму, але яна нечакана для многіх вокамгненна апынулася ў эліце беларускага міні-футбола. Пасля двух тураў* ***на рахунку калектыву нічыя і паражэнне*** (Звязда). «Знаходжанне пераможаных унізе» спраўджваецца наяўнасцю прыназоўніка ***над*** у пэўных словазлучэннях: *перамога над шведамі, перамога яўрэяў над ворагам.* Так, «шведы» і «ворагі» – гэта тыя, каму ***на****неслі* (тут прыстаўка «на», таксама сведчыць аб накірунку «зверху ўніз») паражэнне, а гэта значыць – «знаходзяцца ўнізе». Гэта асаблівасць таксама пацвярджаецца прыкладамі, дзе слова «саступілі» азначае «рух уніз»: *А вось на выездзе двойчы саступілі – венгеркам і ізраільцянкам. Асабліва крыўдным было другое паражэнне, усяго два пункты* (Наша Ніва). У наступным сказе: *Люіс вельмі вопытны спецыяліст, выдатна дапамог выбрацца з псіхалагічнай ямы пасля паражэння ад расіян* (Звязда) – слова «яма» азначае паглыбленне ў зямлі, аб'ект, які знаходзіцца ніжэй за ўзровень паверхні зямлі, дзе звычайна ходзяць людзі.

Перыяд пасля паражэння характарызуецца пэўнымі падзеямі: **пазбаўленнямі, паніжэннем у статусе, іншы раз уручэннем суцяшальных узнагарод, зыходам задзейнічаных у паражэнні асоб, пошукам вінаватых, прызнаннем паражэння, падвядзеннем вынікаў**.

Вынікам паражэння выступаюць адначасова два планы: станоўчы, для боку, які атрымаў перамогу, і адмоўны, для боку, які пацярпеў паражэнне. Станоўчы / адмоўны план мае на ўвазе авалоданне / страту матэрыяльных альбо духоўных выгод, здабыццё / страту статусу ў грамадстве. Так, у пераможаных найчасцей адбіраюць што-небудзь (тытул, званне, магчымасць прымаць удзел у далейшай барацьбе), пакідаюць без чаго-небудзь (прызоў, матэрыяльных узнагарод, пашаны): *З 15 матчаў у межах чэмпіянату Расіі пад кіраўніцтвам Кучука «Кубань» выйграла толькі адзін і апусцілася з пятага месца на дзясятае, а пасля паражэння ў фінале Кубка Расіі пазбавілася шансаў згуляць на міжнароднай арэне* (Наша Ніва); *Паражэнне ад Швейцарыі практычна пазбавіла «чырвона-зялёных» шанцаў на магчымы выхад у чвэрцьфінал* (Звязда). Асоба, якая не заняла прызавое месца, усё ж такі мае магчымасць атрымаць **суцяшальную ўзнагароду**: *Нагадаем, пасля трох паражэнняў у папярэднім этапе чэмпіянату свету па хакеі 2011 года зборная Беларусі* ***выбыла з барацьбы за выхад у плэй-оф****. Цяпер беларусы* ***згуляюць у «суцяшальным» стыкавым матчы*** *за тое, каб застацца ў мацнейшым хакейным дывізіёне* (Наша Ніва); *Але што такое Кубак надзеі? Гэта суцяшальны турнір для камандаў, якія не трапілі ў плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі і не могуць пазмагацца за галоўны трафей – Кубак Гагарына* (Звязда).

Пасля няўдачы змагара ў барацьбе за што-небудзь ён павінны **пакінуць** мерапрыемства ці месца, дзе адбываецца падзея: *Дадому адправілася і каманда Расіі пасля буйнога (0:3) паражэння ад Уэльса* (Звязда); *З багатых краін толькі ЗША паспрабавалі наскокам вырашыць праблему, але як толькі іх дэсантнікі пацярпелі першае сур'ёзнае паражэнне, тут жа з краіны ўцяклі* (Звязда).

Згодна са шматлікімі прыкладамі характэрнай рысай беларускага грамадства з'яўляецца **пошук вінаватых**: *Вельмі лёгка зваліць усю віну на іх, але і абаронцы вінаватыя ў пропуску галоў. Значыць, у паражэнні вінаватая каманда* (Наша Ніва); *Пасля гульні галоўны трэнер беларусаў Аляксандр Хацкевіч сказаў, што каманда цалкам правапіла першы тайм у плане абарончых дзеянняў і ўзяў віну за паражэнне на сябе* (Звязда); *Тым не менш, па нашай інфармацыі, ужо дадзены загад разабрацца ў паражэнні нашай зборнай і па неабходнасці пакараць вінаватых* (Наша Ніва).

Пацярпеўшым паражэнне патрабуецца **вялікая смеласць і адвага пагадзіцца з паражэннем**, усвядоміць і прызнаць яго: *Лідар апазіцыйнай Сацыялістычнай партыі Партугаліі Антоніу Кошта, чый блок набраў 32%, прызнаў паражэнне і павіншаваў лідэра кааліцыі, дзеючага прэм'ер-міністра краіны Педру Пасуша Куэльу з перамогай* (Звязда); *«Але мне (Някляеву) кажуць пра тое, які гэта складаны механізм, якія гэта можа прынесці праблемы апазіцыі, што той, хто прайграе, не пагодзіцца са сваім паражэннем. Але з такімі падыходамі лепш наогул ніякую сур'ёзную справу не пачынаць», – упэўнены палітык* (Наша Ніва). Прызнанне паражэння выклікае захапленне з боку грамадскасці: *Усё ж такі прызнаць сваё паражэнне, калі ён да апошняй хвіліны быў упэўнены, што яго ўвесь народ стапрацэнтна падтрымае – гэта дарагога варта. Дарэчы, гэта ацанілі ўсе, і расіяне, і грузіны, і знешнія назіральнікі* (Звязда). Акт прызнання паражэння мае на мэце, па-першае, прадэманстраваць павагу да навакольных, па-другое, не пагоршыць наяўныя абставіны, паколькі годна прынятае паражэнне цэніцца грамадскасцю: *Камароўскі ўжо прызнаў сваё паражэнне. «Сябры мае, не атрымалася. Так вырашылі выбаршчыкі. Дэмакратыя – гэта не толькі прызнанне вынікаў, але і павага вынікаў выбараў. Віншую Анджэя Дуду!»* (Звязда). Так, наступны прыклад ілюструе, якія могуць быць наступствы (*выказванне неадабрэння, асуджэнне, дыскваліфікацыя, экстрадыцыя*), калі чалавек не можа годна прыняць паражэнне і дазваляе эмоцыям узяць над сабой верх: *На жаль, сярод алімпійцаў ёсць тыя, каго загадзя просяць пакінуць Лондан. Сітуацыя з эпатажным швейцарскім футбалістам Мішэлем Марганэлі заслугоўвае асуджэння. Спартсмен так пакрыўдзіўся на паражэнне сваёй зборнай ад Паўднёвай Карэі, што ва ўласным твітары абразіў азіятаў. Зразумела, Марганэлі кіраваўся крыўдай і эмоцыямі, але падобныя паводзіны, мякка кажучы, некарэктныя, ім ёсць адно пакаранне – квіток на радзіму. Як яшчэ вучыць людзей адказваць за свае ўчынкі?* (Звязда).

Пасля таго як суб'екты паражэння поўнасцю, да канца зразумеюць прычыны паражэння, надыходзіць час **падвядзення вынікаў.** Некаторыя ўспрымаюць паражэнне як карысны вопыт, стымул для самаўдасканалення: *Што такое паражэнне? Не што іншае, як урок; не што іншае, як першы крок да чагосьці лепшага* (Звязда); *Тыя падзеі яшчэ раз нагадалі нам пра вераломства фашыстаў. Урокі трэба атрымліваць як з перамог, так і з паражэнняў. Галоўнае – не дапусціць падобнай трагедыі ў далейшым* (Звязда); *Інцыдэнт у Фларэнцыі паказвае, над чым трэба працаваць у наступным сезоне* (Наша Ніва). Да таго ж паражэнне – гэта падзея, якая дапамагае зразумець, чаго не хапае, у тым ліку, якіх сацыяльных устаноў, каб не паўтарыць папярэдніх памылак: *Мой праект «школа Раналда» з'явіўся пасля жудаснага паражэння Бразіліі ад Германіі. Адчуў, што нам не хапае па-сапраўднаму зорных гульцоў* (Звязда).

Часцей за ўсё паражэнне – **рэзанансная публічная з'ява**: *У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» расказвае пра перамогу беларускіх тэнісістаў у Кубку Дэвіса, магчымых сапернікаў беларускіх клубаў у футбольных еўракубках і* ***сенсацыйнае паражэнне*** *БАТЭ* (Звязда); *Нарэшце, шмат хто лічыць, што чыноўнікамі, якія абвясцілі паляванне на Дзеда Мароза, рухае банальная палітычная кан'юнктура плюс жаданне* ***адцягнуць увагу ад фіяска*** *ў гаспадарчым сектары* (Наша Ніва); *На бяду для ГОП кампаніі, амаль кожны публічны выступ яе лідара заканчваецца* ***публічным фіяска****, пасля якога застаецца ці апраўдвацца, ці пераводзіць стрэлкі на пытанні, якія пару тыдняў таму ніхто і не ўздымаў* (Наша Ніва). Чым менш скрышальнае і рэзананснае паражэнне, тым хутчэй яно забываецца: *Паводле слоў трэнера, ні адна каманда ў Паўночнай Амерыцы ніколі не ўспомніць, каму прайгралі, паколькі за акіянам так настройваюць хакеістаў: пасля паражэння разабралі памылкі і праз 15 мінут забылі пра матч* (Звязда); *Нягледзячы на ўсё, у псіхалагічным плане ў камандзе ўсё ў парадку, няма ніякай панікі, мы аналізуем гульні і рыхтуемся да наступных. Паверце, гэтыя* ***паражэнні забудуцца хутка****, бо наперадзе гульні нашмат важнейшыя і цікавейшыя* (Звязда).

Калі паражэнне цярпіць зорка першай велічыні, за плячыма якой ёсць шмат перамог, то негатыўных наступстваў яна можа не адчуць увогуле: *Найлепшая тэнісістка планеты беларуска Вікторыя Азаранка, нягледзячы на паражэнне ў фінале US Open, упэўнена ўзначальвае рэйтынг Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA). У апублікаваным учора спісе Вікторыя Азаранка мае 10265 ачкоў, у расіянкі Марыі Шарапавай, якая ідзе другой, 8435 балаў* (Звязда).

**Паражэнне па сваёй прыродзе дуалістычнае**. У сітуацыі, калі ёсць пераможаны, ёсць і пераможца. Паражэнне для аднаго боку – гэта перамога для іншага боку, але сустракаюцца сітуацыі зыходу падзеі без прызнання перамогі ці выйгрышу за якім-небудзь з бакоў: **Гульня была роўнай. Мы не заслугоўвалі перамогі, але не заслугоўвалі і паражэння** (Звязда); *У апошнім туры расейскага чэмпіянату масквічы згулялі* ***унічыю*** *зь землякамі з «Тарпэда» – 1:1, упусьціўшы перамогу на апошняй хвіліне* (Наша Ніва). **Адпаведна, паражэнне ўваходзіць у паняцце перамогі і складае яе неад'емную частку.**

У розных сацыяльных сферах жыццядзейнасці беларускага народа паражэнне прадстаўлена па-рознаму.

**Паражэнне ў спорце** ўяўляе сабой няўдачу адной асобы (спартсмена) або групы асоб (спартыўнай каманды) у спартыўнай сустрэчы ці ў спаборніцтве за прызавое месца. Кожнае спартыўнае мерапрыемства не можа не мець нейкі канкрэтны вынік для спартсмена ці спартыўнай каманды. Існуе тры варыянты зыходу падзей: перамога, паражэнне, нічыя. *Радасць перамог і горыч паражэнняў – неад'емная рыса кожнага футбольнага года, але любы матч сканчаецца з канкрэтным вынікам* (Звязда).

У спартсменаў за іх кар'еру мае месца вялікая колькасць як паражэнняў, так і перамог. Ніводны спартсмен не абмяжоўваецца толькі адной перамогай ці паражэннем: *серыя з трох паражэнняў, чарговае паражэнне, серыя з пяці паражэнняў, 10 паражэнняў у асноўны час, пацярпець 13-ю паразу; Вось бачыце, у гэтым годзе мы масць мяняем (смяецца). Пачалі з паражэнняў – значыць, на чэмпіянаце свету выступім добра* (Звязда); *Мінская каманда спыніла серыю з пяці паражэнняў запар* (Наша Ніва); *Становішча: С. Уільямс – 3 перамогі (6–1), Дзяменцьева – 1 перамога, 1 паражэнне (2–3), В. Уільямс – 1 перамога, 2 паражэнні (4–5), Кузняцова – 2 паражэнні (1–4)* (Наша Ніва).

Пасля няўдачы спартсмена або каманды ў спаборніцтве яны павінны **пакінуць спартыўнае мерапрыемства**: *Жоўта-блакітныя пакінулі турнір, пацярпеўшы на Еўра-2016 тры паражэнні – ад зборных Германіі (0:2), Паўночнай Ірландыі (0:2) і Польшчы (0:1). У 2000 годзе не ўдалося трапіць у вароты камандзе Даніі, якая на групавым этапе таксама пацярпела тры паражэнні. Пры гэтым з'ехаць дадому без забітых мячоў на цяперашнім чэмпіянаце Еўропы рызыкуе і зборная Аўстрыі* (Звязда). Назіраецца тэндэнцыя **зыходу трэнераў у адстаўку** пасля паражэння іх падапечных каманд: *Галоўны трэнер зборнай Англіі Рой Ходжсан падаў у адстаўку пасля паражэння ад Ісландыі ў матчы 1/8 фіналу чэмпіянату Еўропы па футболе* (Звязда); *Палякі адправілі ў адстаўку свайго футбольнага генерала Ежы Энгеля, не дазваляючы яму нават патлумачыць прычыну пройгрышу свае каманды* (Наша Ніва). Асоба, якая не заняла прызавое месца, не атрымлівае ўзнагароды, выключэннем з'яўляюцца суцяшальныя прызы.

Калі адбываецца нешта экстраардынарнае, рашэнне прысудзіць перамогу ці паражэнне даецца спартыўным суддзям: арбітрам, рэферы ці трацейскім суддзям. У такіх выпадках залічваюць тэхнічнае паражэнне. Тэхнічнае паражэнне – гэта вынік у спартыўных спаборніцтвах, што залічваецца аднаму з бакоў, які ўдзельнічае ў спаборніцтве, без правядзення гульні з сапернікам альбо пасля яе датэрміновага заканчэння, а таксама з-за адмены выніку праведзенай гульні. Саперніку таго, хто атрымаў тэхнічнае паражэнне, залічваецца тэхнічная перамога альбо абодвум бакам залічваецца нічыя ці паражэнне. Адным з тыповых прыкладаў такой сітуацыі з'яўляецца няяўка аднаго або абодвух бакоў на гульню: *Учора каманда прэзідэнта Беларусі ў паўфінале турніру павінна была згуляць з камандай «Неўскі легіён». Аднак гульня не адбылася, беларускім хакеістам было залічана* ***тэхнічнае паражэнне*** *з лікам 0:5* (Наша Ніва). Акрамя накладання тэхнічнага паражэння, у залежнасці ад цяжару здзейсненай дысцыплінарнай правіны, заснавальнікамі спартыўнага мерапрыемства могуць быць прыняты меры да вінаватага боку: *У«Ліды» зламаўся аўтобус і каманда не прыехала ў Мінск. «Лідзе» пагражае* ***тэхнічнае паражэнне*** *з лікам 0:3, а таксама магчыма* ***накладанне іншых дысцыплінарных захадаў*** (Наша Ніва). Прыняцце кампетэнтнымі суддзямі рашэння не выключае чалавечы фактар. Памылка суддзяў успрымаецца як іх асабістае паражэнне: «*Як і ў футбалістаў, у нас таксама здараюцца паражэнні. Мы вельмі расчараваныя, бо гэтая памылка паўплывала і на нас», – падсумаваў арбітр* (Наша Ніва).

**Паражэнне ў палітыцы** звязваецца з няўдалай спробай атрымаць кіруючую пасаду ў выніку галасавання, а таксама з правалам законапраекта ці якой-небудзь палітычнай кампаніі. *Але, зразумела, сапраўдным шокам для Еўрасаюза стала паражэнне ад рэзкага змянення пазіцыі Украіны ў лічаныя дні перад самітам* (Звязда); *Прэзідэнт выказаў нязгоду з папрокам з боку кіраўніцтва польскай нацыянал-кансерватыўнай партыі «Права і справядлівасць», якое мяркуе, што ўсходняя палітыка Польшчы пацярпела паражэнне ў Беларусі* (Наша Ніва); *Між тым перамовы прэм'ераў Сідорскага і Пуціна на пачатку кастрычніка па комплексе балючых пытанняў гандлёва-эканамічных узаемадачыненняў скончыліся пшыкам* (Наша Ніва).

У беларускай свядомасці **ваеннае паражэнне** – гэта поўнае падаўленне супраціву войскаў праціўніка, у выніку чаго адбываецца поўнае скончэнне баявых дзеянняў, страта ўласнай тэрыторыі, багаццяў, небяспека для пераможаных: *Вайсковая стратэгія: вайна да перамогі, да поўнай акупацыі краіны, да поўнай зачысткі* (Наша Ніва); *Пётр Першы, страціўшы пасля паражэння пад Нарвай усю артылерыю, загадаў адліваць новыя гарматы менавіта з выраблены з бронзы званоў* (Звязда); *Пераломны момант першага этапу Стогадовай вайны. Яе вынікам стала шматгадовая акупацыя вялікай часткі французскіх тэрыторый і гістарычная сіла Англіі* (Наша Ніва). Ваеннае паражэнне суправаджаецца стратамі вялікай колькасці як грамадзянскага насельніцтва, так і вайскоўцаў: *У выніку спроба паўстанцаў на чале з Каліноўскім адрадзіць вольнае ад Расіі ВКЛ у якасці дзяржавы для продкаў сучасных беларусаў скончылася паражэннем і вынішчэннем мясцовай эліты* (Наша Ніва); *Армія саюзнікаў была цалкам знішчана, а кароль Польшчы Уладзіслаў III загінуў на полі бітвы. Польшча і Венгрыя перайшлі ў шматвекавое адступленне. Рэч Паспалітая так і не здабудзе ўпэўненага выхаду да Чорнага мора* (Наша Ніва). Згодна з наступным прыкладам, каб дасягнуць глабальнай перамогі, неабходна ахвяраваць чым-небудзь меншым: *Пры ім кіраўніком генеральнага штаба становіцца Урублеўскі, які разам з Каліноўскім і іншымі «чырвонымі» вырашыў пайсці на кампраміс – у імя вышэйшай мэты. І 29 красавіка паўстанцы церпяць першае цяжкае паражэнне ў бітве пад Валілкамі ў Сакольскай пушчы* (Наша Ніва). Пасля паражэння галоўныя дзеючыя асобы пераможанага боку падвяргаюцца праследу, вымушаны хавацца за межамі краіны: *Пасля яго* (Ігнат Дамейка) *паражэння былі доўгія гады вымушанай эміграцыі і сусветная вядомасць, якая напаткала Ігната ў Чылі* (Звязда); *Браў удзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1863–1864 гадоў, пасля паражэння быў арыштаваны і пасаджаны ў Дынабургскую крэпасць. Неўзабаве прадаў маёнтак Крэўна і выехаў у Германію, дзе працягнуў навучанне ў мюнхенскай Акадэміі мастацтваў* (Наша Ніва).

**Рэлігійнае паражэнне** ўяўляе сабой дасягненне абсалютнай перавагі зла над дабром. Лічыцца, што малітва беражэ ад нягод у любой справе: *Паводле яго слоў, экс-прэзідэнт пацярпеў поўнае паражэнне, калі ў царкве перасталі маліцца за яго здароўе* (Наша Ніва). У Пісанні гаворыцца, што ўсе людзі першапачаткова роўныя перад Богам: *Роўнасьць перад Богам замяняецца роўнасьцю шанцаў і магчымасьці для пераможцы і пераможанага памяняцца месцамі* (Наша Ніва). Вера ёсць шлях да перамогі жыцця над смерцю (*Уваскрасенне Хрыста – гэта Яго перамога над грахом і смерцю* (Звязда), а адсутнасць веры вядзе да паражэння (*Не верыць у змёртвыхпаўстанне Хрыста – гэта значыць жыць так, як быццам крыж з'яўляецца канцом усяго, быццам жыццё Хрыста і Яго крыжовая ахвяра былі безнадзейным крахам, дарэмным і абсурдным паражэннем* (Наша Ніва).

Паражэнне **ў любоўнай сферы** распаўсюджваецца як на ўзаемаадносіны, так і фізічныя кантакты паміж партнёрамі: *Я зазірнула ў яго вочы… і страціла прытомнасць, і ўпала ў іх, і даляцела да самага дна. І там, на дне, зведала ўсё – і асалоду падзення, і веліч паражэння, і радасць болю* (Звязда); *Ёсць такое паняцце – сэксуальнае фіяска. Яны ёсць і былі заўсёды ва ўсіх. Няма людзей, у якіх за ўсё жыццё не было ніводнага сэксуальнага фіяска* (Наша Ніва).

Прыкметы, звязаныя з іншымі ментальнымі прасторамі, якія нясуць інфармацыю аб рэальных сувязях, існуючых у рэчаіснасці, прадстаўляюць **бліжэйшую перыферыю паняцця *паражэнне*.**

Паражэнне **асацыіруецца з болем** у прамым (фізічныя пакуты) і пераносным сэнсах (маральныя пакуты): *Тыя **паражэнні – як ком у горле** для мяне і многіх хлопцаў у нашай камандзе, хто ўжо выступаў на чэмпіянаце свету* (Звязда); *Так мексіканскі вундэркінд Чычарыта, з цяжкасцю стрымліваючы слёзы, пракаментаваў паражэнне так: «Мне **балюча**, але трэба праглынуць гэта крыўднае паражэнне. Мне **балюча**, але трэба павіншаваць «Барселону», якая выйграла сёння цалкам заслужана»* (Наша Ніва); *Вядома, **боль ад паражэння** ў Мінску ўжо не такі, таму што мы ўжо забяспечылі сабе месца ў 1/8 фіналу, але нам трэба першае месца* (Наша Ніва); *Усе, безумоўна, верылі ў каманду, падтрымлівалі яе, аднак наўрад ці былі тыя, хто мог дакладна прадказаць сцэнарый супрацьстаяння БАТЭ і «Ромы». **Непрыемныя вынікі** «жоўта-блакітных» у леташнім турніры, калі барысаўчане **пацярпелі некалькі балючых** паражэнняў, разам з нядаўняй няўдачай ад «Баера» дабавілі скептычных поглядаў у бок беларусаў* (Звязда). Паражэнне звязваюць з **непрыемным святлом** і **смакам**, якія прыносяць дыскамфорт: *Так ці інакш, **асьляпляльнае фіяска** церпіць канцэпцыя будаваньня складоў камандаў вакол «найлепшых Майклаў Джорданаў», якімі ў 1990-я гады стракацелі рады НБА* (Наша Ніва); *Па ступені **горычы фіяска** ў Карагандзе можаш параўнаць з нейкім іншым?* (Наша Ніва); *Падапечныя Біла Пітэрса ў гэтым годзе яшчэ не ведаюць **горычы паражэнняў**, як і ў мінулым, у Празе, калі ў складзе зборнай Канады бліставаў Сіднэй Крозбі* (Звязда); *Але падобнае паражэнне часам **«смачнейшае»** за самую марудную перамогу* (Звязда); *У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра тое, якая падзея «падсаладзіла» паражэнне Вікторыі Азаранкі ў фінале US OPEN* (Звязда). Аналіз наступных сказаў дазволіў вызначыць, што паняцце *паражэнне* мае характарыстыкі фізічнай з'явы – **гучання**: *У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра сенсацыйную перамогу беларускіх хакеістаў і іх не менш **гучнае паражэнне,** чарговы футбольны тур чэмпіянату краіны і трыумф брэсцкіх гандбалістаў* (Звязда); *З гісторыі нам вядома, што знакамітая Грунвальдская бітва, якая адбылася 15 ліпеня 1410 года, скончылася перамогай войска саюзнікаў, што падчас гэтага крывавага змагання вялікі магістр Тэўтонскага ордэна быў забіты, і пасля **гучнага паражэння** нямецкія ваяры цягам некалькіх стагоддзяў не нападалі на нашы землі* (Звязда). Згодна з наступнымі прыкладамі паняцце *паражэнне* мае **колькасныя і якасныя паказчыкі**: *Большасць амерыканцаў лічаць вайну ў Іраку прайгранай На думку 59 працэнтаў грамадзян, гэта вайна ў гісторыі ЗША застанецца **поўным ці частковым паражэннем** амерыканцаў* (Звязда); *Нічыя і **мінімальнае паражэнне**. Менавіта такія вынікі прынеслі першыя матчы другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы* (Звязда). Наступныя прыклады ілюструюць, што паражэнне характарызуецца **вагой**: *Гэта **цяжкае паражэнне**, але выйсці ў фінал і гуляць супраць лепшай тэнісісткі свету было прыемна* (Звязда); *Гэтыя тры цяжкія паражэнні могуць ударыць па псіхалогіі нашых гульцоў, і тады гэта стане вялікай праблемай* (Звязда); ***Трохі спаў націск**, які мы адчувалі пасля двух паражэнняў на старце турніру* (Наша Ніва).

Прыкметы, якія перадаюць уяўленні аб суб'ектыўна-мадальных ацэначных сэнсах, уваходзяць у **далёкую перыферыю паняцця *паражэнне***. Феномен паражэння ў асноўным **ацэньваецца адмоўна** – словы, якія рэпрэзентуюць паняцце *паражэнне,* у сваёй семантычнай структуры пераважна ўтрымліваюць адмоўна-ацэначныя кампаненты: *безнадзейны крах, дарэмнае і абсурднае паражэнне, скрышальнае паражэнне, ганебнае паражэнне*; *Міністр заявіў, што выступленне каманды гаспадароў ЧС заслугоўвае «самай негатыўнай ацэнкі»* (Наша Ніва); *Падапечныя Алега Кубарава прадэманстравалі той футбол, якога нам не хапае. Таму не дзіўна, што паражэнне некаторыя футбалісты ўспрынялі, як маленькую драму…* (Звязда); *І 29 красавіка паўстанцы церпяць першае цяжкае паражэнне ў бітве пад Валілкамі ў Сакольскай пушчы, якое, адзначаў Каліноўскі, «дрэнна падзейнічала на вакольнае насельніцтва»* (Наша Ніва).

Жаданне ўзяць рэванш у некаторых выпадках выклікана негатыўнымі пачуццямі, напрыклад, помстай – жаданнем **адплаціць за прычыненае зло:** *У першым матчы падапечныя Рымантаса Грыгаса*

*«адпомсцілі» чэшкам за ўсе папярэднія паражэнні* (Звязда); *Паражэнне расійскай каманды з Японіяй выклікала ў маскоўскіх патрыётаў такую патрэбу рэваншу, што гатовыя былі яны знішчыць усё японскае ў гэтым горадзе, а нават і расійскае, калі надта напамінала замежнае паходжанне* (Наша Ніва).

Нават паражэнне **можа ацэньвацца станоўча**, калі яно нанесена злодзеям, накіравана на вызваленне захопленых людзей, зямель: *Толькі дзякуючы адзінству шматнацыянальнага савецкага народа, які ад малога да вялікага паўстаў на абарону агульнай Айчыны, удалося разграміць магутнага, да тых часоў непераможнага ворага. Прытым не проста* ***выгнаць агрэсара са сваёй тэрыторыі****, але і* ***вызваліць усё чалавецтва ад пагрозы фашысцкага прыгнёту****, – адзначыў Аляксандр Лукашэнка. – Менавіта паражэнне гітлераўцаў на Усходнім фронце вызначыла зыход Другой сусветнай вайны, а потым і ўсё пасляваеннае ўладкаванне свету* (Наша Ніва).

Нягледзячы на тое, што паражэнне адбіваецца адмоўна на пацярпелых, дзеля сваёй выгады паражэння могуць жадаць суперніку: *Каб застацца ў дывізіёне наймацнейшых, камандзе трэба выйграць усе тры паядынкі* ***і спадзявацца на паражэнне адной з трох камандаў****, якія стаяць вышэй – «Нёману», «Тарпеда» ці «Гомеля»* (Звязда); *А яшчэ* ***жадалі «Гомелю» паражэння*** *ў гульні з македонскай «Рэновай», каб не ляцець у невядомую Усходнюю Еўропу* (Звязда).

Паражэнне – **перажывальная з'ява**, якая выклікае пачуцці крыўды, здзіўлення, трывогі: *Нягледзячы на паражэнне, я не адчуваю бязвыхаднасці* (Наша Ніва); *Потым дзяўчына выступіла на Алімпійскіх гульнях у Лондане, дзе было* ***крыўднае паражэнне*** *ў барацьбе за бронзавы медаль* (Звязда); *Розніца паміж еўрапейскім і найлепшымі ўзорамі паўднёваамерыканскага футзала пакуль вялікая, а таму не трэба вельмі* ***здзіўляцца паражэнню*** *беларусаў.* ***Вока рэзаць можа*** *толькі буйны лік* (Звязда); *Сказаць пра тое, што паражэнні ў гэтых сустрэчах сталі нечаканасцю як для спецыялістаў, так і для аматараў хакея, нельга. Аднак ноткі трывожнасці чытаюцца ва ўсіх, каму не абыякавая наша зборная* (Звязда).

**Рэакцыя на чыё-небудзь паражэнне часцей негатыўная**, таму што ў кожнага боку ёсць балельшчыкі, група падтрымкі, тыя, хто верыць у змагароў. *Дадому адправілася і каманда Расіі пасля буйнога (0:3) паражэння ад Уэльса. Прыхільнікі зборнай даволі балюча ўспрынялі вынік гэтага матча і ў цэлым удзелу каманды ў Еўра-2016. У сеціве з'явілася* ***шмат негатыўных і абразлівых каментарыяў, малюнкаў і калажаў з гэтай нагоды*** (Звязда). Балельшчыкі могуць не абмяжоўвацца абразамі ў вуснай і пісьмовай форме, адзначаны сітуацыі, у якіх даходзіць да **рукапрыкладства і беспарадкаў**: *Расстроеныя паражэннем сваёй каманды, балельшчыкі імкнуліся справакаваць бойкі з расійскімі турыстамі, а таксама са швейцарцамі і нават учынялі патасоўкі паміж сабой* (Звязда); *А ў фан-зоне адбылася бойка. Турэцкія балельшчыкі ўчынілі патасоўку адразу пасля гола свайго форварда Семіха Шанцюрка, які зраўняў лік на другой дабаўленай хвіліне да дадатковага часу матча, спынілі стычку на час паслярматчавых пенальці – і працягнулі пасля матча* (Звязда).

**Асноўныя лексічныя рэпрэзентацыі паняцця *паражэнне*** ранжыраваны па частаце ўжывання на 500 кантэкстаў. У тэкстах газетна-публіцыстычнага стылю паняцце *паражэнне* прадстаўлена наступным сінанімічным радам: *правал* (21), *фіяска* (17), **ПАРАЗА** (12), *пройгрыш* (10), **НАКАЎТ** (10), **ЗРЫЎ** (9), **РАЗГРОМ** (5), *крах* (5), **ПШЫК** (5), **АСЕЧКА** (3), **АБЛОМ** (3), *няўдача* (3). Антанімічны рад таксама на матэрыяле 500 кантэкстаў выглядае наступным чынам: *перамога* (395), *поспех* (30), *дасягненне* (30), *вікторыя* (13), *удача* (6), *трыумф* (5), *верх* (5), *фартуна* (3), *выйгрыш* (3), *плён* (2), *фурор* (1).

Да асноўных лексічных рэпрэзентацый паражэння былі аднесены наступныя: няўдача, пройгрыш у чым-небудзь, поўнае адоленне праціўніка: *фіяска* (17), **ПАРАЗА** (12), **РАЗГРОМ** (5); адмоўны вынік працы, дзейнасці: *пройгрыш* (10), *няўдача* (3), *крах* (5); пацярпець няўдачу, імкнучыся асіліць што-небудзь (размоўн.): **АБЛОМ** (3); каманда ці спартсмен, якія займаюць апошняе месца ў спаборніцтве: *аўтсайдар* (8); няўдачлівы чалавек: *няўдачнік* (3); той, хто застаецца ў пройгрышы: лузер (1); той, каго перамаглі: пераможаны (11); такі, якога можна адолець, перамагчы ў барацьбе: *пера*адольны (4); аказацца горшым за каго-небудзь па сілах у барацьбе, спаборніцтве: *прайграць* (31), *уступіць* (5); адсутнасць выйгрышу і пройгрышу ў выніку барацьбы: нічыя (15).

Сярод **комплексных сумешчаных рэпрэзентацый** у тэкстах былі вылучаны наступныя лексічныя адзінкі: стан баксёра ў час бою, калі ён пасля моцнага ўдару не можа падняцца і лічыцца пераможаным: накаўт (10); чалавек, які аказаўся няздольным апраўдаць чые-небудзь надзеі і пацярпеў ідэйнае крушэнне (перан.): банкрут (3); правал у ідэйнай, палітычнай дзейнасці якой-небудзь асобы або арганізацыі (перан.): банкруцтва (6); безнадзейная, пройгрышная сітуацыя (разм.): *капут* (5); завяршэнне, заканчэнне справы, дзеяння: *канец* (7); узнагарода пацярпеўшага паражэнне ў спаборніцтве: *суцяшальны прыз* (1), *суцяшальны турнір* (1), *суцяшальны матч* (1), *суцяшальны раўнд* (1).

**Устойлівыя асацыятыўна-вобразныя рэпрэзентацыі** прадстаўлены ў газетна-публіцыстычных тэкстах наступным чынам. Поўная няўдача ў якой-небудзь справе (перан.): *правал* (21), (перан.): **АСЕЧКА** (3). Калі вялікія намаганні заканчваюцца паражэннем, нічым (разм.): *пшык* (5). Пацярпець паражэнне: *апынуцца* **Ўнізе** (3). Разбіць у баі вельмі ўпэўнена, поўнасцю (перан.): *парваць* (8). Нанесці вельмі моцнае паражэнне ў выніку барацьбы: *разграміць* (16), *разбіць* (4), *разнесці* (3), *сакрушыць* (1), *скрышыць* (3), *знішчыць* (3).

Быць пераможаным, здацца, скарыцца (пра горад, крэпасць): *пасці* (8). Саступіць каму-небудзь у паядынку (жарг.): *зліў* / *зліць* (4). Пакінуць барацьбу ў выніку паражэння: *саступіць* (23), *зыход / сысці* (2). Пакінуць спаборніцтва ў выніку скрышальнага паражэння: *вылет / вылецець* (7). Не патрапіць у лік тых, каму пашанцавала; не змагчы скарыстацца чым-небудзь (разм.): *праляцець* (3). Апынуцца ў кепскім, недарэчным становішчы; пацярпець няўдачу ў чым-небудзь (жарг.): *аблажацца* (8), (разм.): *схібіць* (8), *канфуз* (6). Спецыяльна даць праціўніку выйграць у гульні (разм.): паддацца (3). Прайграць у якой-небудзь гульні, спартыўных спаборніцтвах (разм.): *прадуць* (10). Змарнаваць, прапусціць магчымасць выйграць (разм.): *страціць* (5), *згубіць* (5). Няўдача ў чым-небудзь, правал у якой-небудзь справе: **ЗРЫЎ** (9). Вымушаная адмова ад далейшых спроб перамагчы: *спасаваць* (11). Які выключае магчымасць поспеху: *безнадзейны* (5).

Падсумоўваючы вынікі аналізу, трэба адзначыць, што прадстаўленае ў артыкуле апісанне паняцця *паражэнне* адлюстроўвае сучасны стан фрагмента беларускай нацыянальнай моўнай карціны свету. У першай частцы апісання прыводзіцца сукупнасць кагнітыўных прыкмет, якія складаюць паняцце *паражэнне*. Яно ўяўляе сабой іерархічна арганізаваную палявую структуру, у якой ёсць ядро, прыядзерная зона, бліжэйшая і далёкая перыферыі. У ядры паняцця прадстаўлены базавыя кагнітыўныя прыкметы, якія перадаюць самыя істотныя ўяўленні аб паняцці *паражэнне*: *поўны разгром праціўніка, чалавека, які імкнецца перамагчы іншага, пазбаўленне яго баяздольнасці з прычыны няўдачы, пройгрышу, адмоўнага выніку, няшчаснага збегу абставін у чым-небудзь*. У прыядзернай зоне прадстаўлены істотныя кагнітыўныя прыкметы, якія канкрэтызуюць паняцце. Паражэнне абумоўлена недахопам пэўных станоўчых якасцей у чалавека і валявога ці рашучага прымянення намаганняў, накіраваных на паспяховае пераадоленне перашкоды. Суб’екты і аб’екты паражэння могуць чаргавацца, яны могуць быць прадстаўлены адной асобай, групай асоб ці абстрактнымі сутнасцямі. Само паражэнне можа выступаць у якасці суб’екта дзеяння. Паражэнне рэалізуецца ў часе і характарызуецца наяўнасцю этапаў, кожны з якіх мае пэўныя часавыя інтэрвалы, і можа быць графічна аб’ектывавана ў выглядзе лініі, якая рухаецца наперад і рэзка ўніз. Перыяд пасля паражэння характарызуецца пэўнымі падзеямі: пазбаўленнямі, паніжэннем у статусе, іншы раз уручэннем суцяшальных узнагарод, зыходам задзейнічаных у паражэнні асоб, пошукам вінаватых, прызнаннем паражэння, падвядзеннем вынікаў. У розных сацыяльных сферах жыццядзейнасці беларускага народа (спартыўнай, палітычнай, ваеннай, рэлігійнай, любоўнай) паняцце *паражэнне* актуалізуецца па-рознаму. *Паражэнне* ўваходзіць у паняцце *перамога* і складае яе неад’емную частку. Бліжэйшая перыферыя сфарміравана прыкметамі, якія нясуць інфармацыю аб рэальных сувязях, што існуюць у рэчаіснасці з іншымі кагнітыўнымі прыкметамі. Паражэнне асацыіруецца з болем у прамым (фізічныя пакуты) і пераносным сэнсах (маральныя пакуты), непрыемным святлом і смакам, пэўным гучаннем, колькаснымі і якаснымі паказчыкамі. Далёкая перыферыя паняцця прадстаўлена прыкметамі, якія перадаюць суб’ектыўна-мадальныя і ацэначныя сэнсы: феномен паражэння ацэньваецца адмоўна. Паражэнне – перажывальная з’ява, якая выклікае пачуцці крыўды, здзіўлення, трывогі. Людзі імкнуцца пазбегнуць свайго паражэння, але ўкладваюць шмат сіл і сродкаў, каб нанесці паражэнне праціўніку. Рэакцыя на чыё-небудзь паражэнне часцей негатыўная, яна можа не абмяжоўвацца абразамі ў вуснай і пісьмовай формах. Адзначаны сітуацыі, у якіх справа даходзіць да рукапрыкладства і беспарадкаў.

Другая частка артыкула прадстаўлена асноўнымі лексічнымі рэпрэзентацыямі паняцця (15 адзінак), комплекснымі сумешчанымі рэпрэзентацыямі (9 адзінак), устойлівымі асацыятыўна-вобразнымі рэпрэзентацыямі (27 адзінак), атрыманымі ў выніку аналізу 500 кантэкстаў газетна-публіцыстычнага стылю.

Інтэнсіфікацыя лінгвакультурнай лексікаграфічнай працы спрыяе развіццю беларускай ідэаграфічнай лексікаграфіі, пашырэнню сферы выкарыстання і функцыянавання беларускай мовы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Романовская, А.А. Античная символика и ее семантико-прагматические функции в современном художественном тексте / А.А. Романовская. – Минск : МГЛУ, 2013. – 308 с.
2. Попова, З.Д. Когнитивная лингвистика / З.Д. Попова, И.А. Стернин. – М. : Восток-Запад АСТ, 2007. – 314 с.
3. Корнилов, О.А. Языковые картины мира как производные национальных менталитетов / О.А. Корнилов. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : ЧеРо, 2003, – 349 с.
4. Верещагин, Е.М. Лингвострановедческая теория слова / Е.М. Верещагин, В.Г. Костомаров. – М. : Русский язык, 1980. – 320 с.
5. Верещагин, Е.М. Язык и культура / Е.М. Верещагин, В.Г. Костомаров ; под ред. Ю.С. Степанова. – М. : Гос. ин-т рус. языка им. А.С. Пушкина : Индрик, 2005. – 1038 с.
6. Концептосфера русского языка: ключевые концепты и их репрезентация в языке и речи (на материале лексики, фразеологии и паремиологии) : слов. / под общ. ред. проф. Л.Г. Бабенко. – М. : Изд. центр «Азбуковник», 2017. – 1020 с.
7. Беларускі N-корпус [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://bnkorpus.info. – Дата доступа: 21.08.2019.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65000 слоў / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; пад агульн. рэд. І.М. Бунчука [і інш.]. – 4-е выд. – Мінск : Бел. Энцыклапедыя, 2005. – 783 с.

9. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / Нац. акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства ім. Я. Коласа ; пад рэд. І.Л. Капылова [і інш.]. – Мінск : Бел. Энцыклапедыя, 2016. – 967 с.
10. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т., 6 кн. / Акад навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад агул. рэд. К.К. Атраховіча (К. Крапівы). – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1977–1984. – Т. 5.

*Паступіў 02.07.2021*

## MEANS OF *DEFEAT* CONCEPT REPRESENTATION IN THE BELARUSIAN LINGUISTIC WORLD-IMAGE

***A. KUTS***

*The article is dedicated to the description of the concept of defeat as a fragment of the Belarusian national linguistic world-image. The article is presented in the form of a description of the set of cognitive features that make up the mental essence of the concept, as well as the main lexical representations of the concept of defeat, complex combined representations and fixed associative-figurative representations. The content of the article was obtained through the analysis of 500 newspaper 'Zvyazda' and 'Nasha Niva'contexts, from the Belarusian N-corpus platform.*

***Keywords:*** *linguistic picture of the world, concept, ideographic principle of dictionary description, mental essence of the concept, lexical representation of the concept.*